# «Мы поўныя рашучасці разам супрацьстаяць усім нападкам»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Таксама прэзідэнты абедзвюх краін абмеркавалі павелічэнне колькасці палётаў у Санкт-Пецярбург, Сочы, Казань, Краснадарскі край і яшчэ шэраг расійскіх рэгіёнаў.

***«Галоўнае — даць работу нашым пілотам і задзейнічаць самалёты, якія мы закупілі. Пілоты ў нас класныя, парк абнавіўся. Я абяцаў, што «Белавію» мы ў бядзе не кінем. Гэтую кампанію, чаго б нам гэта ні каштавала, — справа гонару падтрымаць па ўсіх напрамках»,*** — запэўніў Аляксандр Лукашэнка і даручыў міністру замежных спраў і міністру транспарту як мага раней рэалізаваць дасягнутыя дамоўленасці. Таксама Прэзідэнт загадаў міністру транспарту прапрацаваць з расійскім калегам пытанне паездак беларусаў у Крым.

Нягледзячы на меры, якія прымаюцца для таго, каб нашы грамадзяне маглі падарожнічаць за мяжу, Аляксандр Лукашэнка заклікаў беларусаў сёлета больш паездзіць па краіне. ***«Мяне засмучае, што ў нас беларусы не ведаюць Беларусі, асабліва моладзь. Яны добра арыентуюцца ў Эміратах, Чарнагорыі, Турцыі, а Беларусі не ведаюць. А мясцін выдатных дастаткова. Я папрасіў бы не імкнуцца кудысьці ляцець з трыма-чатырма перасадкамі»,*** — акцэнтаваў Прэзідэнт.

## «Усе пастаўкі будуць ажыццяўляцца ў запланаваных аб'ёмах»

Кіраўнікі дзвюх дзяржаў шмат увагі ўдзялілі пытанням пастаўкі нафты. Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, урады Беларусі і Расіі сур'ёзна над гэтым папрацавалі і ніякіх праблем і пытанняў з пастаўкамі нафты не будзе. Усе яны будуць ажыццяўляцца ў запланаваных аб'ёмах.

Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін дасягнулі прынцыповай дамоўленасці па мінімізацыі страт беларускіх НПЗ ад падатковага манеўру ў Расіі з 1 студзеня 2022 года. Урады яшчэ канчаткова адпрацуюць гэтую схему. А дыялог на дадзеную тэму будзе працягвацца.

Не была пакінута без увагі і тэма кошту прыроднага газу. ***«Няма ніякіх праблем з пастаўкай прыроднага газу. Колькі трэба — столькі і будзе. Гэтае пытанне канчаткова не закрытае. Прэзідэнт мне паабяцаў, што яны збяруцца і падумаюць, як у гэтай сітуацыі дапамагчы Беларусі з цаной на газ»,*** — распавёў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што ёсць намер дасягнутыя дамоўленасці замацаваць у міжурадавым пагадненні.

## «Галоўнае — каб быў давер»

Адзін з пунктаў парадку дня двух прэзідэнтаў — збліжэнне мытных служб і заканадаўства. Але, па словах Аляксандра Лукашэнкі, гэта не самае вострае пытанне. Паколькі праведзена вялікая работа ў межах ЕАЭС, у Беларусі і Расіі вельмі блізкае мытнае заканадаўства. Таму няма неабходнасці ў стварэнні нейкай наднацыянальнай структуры. Магчыма, дастаткова прапрацаваць стварэнне пэўнага цэнтра, які будзе мець доступ да мытных працэсаў у Беларусі, і ў Расіі.

Беларускі лідар падкрэсліў, што ў рэалізацыі падатковай палітыкі Беларусі і Расіі не павінна быць ніякай насцярожанасці. ***«Галоўнае — каб быў давер. Без гэтага мы нікуды не рушым. Калі мы хочам, каб Расія была надзейным партнёрам, салідарным, трэба весці адкрытую палітыку.*** Тое ж самае з боку Расіі», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што такія ўмовы захаваюцца, нават калі збліжэнне беларускага і расійскага падатковага заканадаўства адбудзецца, што прапануе расійскі бок.

Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін абмеркавалі і пытанні ваенна-прамысловага комплексу. Але, як падкрэсліў беларускі лідар, ніякіх абмеркаванняў у плане перакідання на пастаяннай аснове Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі, стварэння нейкіх баз у Сочы не вялося. Але, паколькі Расія знаходзіцца побач з Беларуссю, у выпадку падазронай ваеннай актыўнасці з боку НАТА саюзніцкія падраздзяленні на працягу сутак могуць быць перакінутыя ў Беларусь. «У выпадку абвастрэння», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

## «Усё павінна быць разумна»

Прэзідэнт расказаў, што яны з расійскім калегам «вельмі доўга» абмяркоўвалі пытанне супрацьстаяння санкцыям. І дамовіліся знайсці алгарытм адказу на абмежавальныя меры з боку Захаду. Беларускі лідар даручыў ураду не зацягваць з рашэннем гэтага пытання. «Усё павінна быць разумна, не наскокам, не трэба страляць сабе ў нагу, у руку», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Лідары дзвюх дзяржаў не пакінулі без увагі праблему, якая сёння датычыцца ўсіх, — пандэмію каранавіруса, лячэнне людзей, адкрыццё граніц і барацьбу з наступствамі пандэміі. Таксама былі закранутыя пытанні знешняй палітыкі, у прыватнасці, запланаваная сустрэча прэзідэнта Расіі з прэзідэнтам ЗША Джо Байдэнам.

Беларускі лідар расказаў, што нават не згадваў пытанне пра паступленне другога траншу крэдыту. Але ў канцы перагавораў на гэта пытанне звярнуў увагу Уладзімір Пуцін. «Прэзідэнт Расіі, калі мы развітваліся, мне на хаду сказаў: я табе павінен нагадаць, што другі транш па ранейшай дамоўленасці аб крэдыце на мільярд долараў вы атрымаеце літаральна ў чэрвені», — распавёў Аляксандр Лукашэнка.

## Уражанні толькі станоўчыя

Падводзячы вынікі перагавораў у Сочы, Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што ў яго засталіся станоўчыя ўражанні. Ён адзначыў, што ўжо пачаўся рух па доўгатэрміновых пытаннях, і калі краіны будуць працягваць актыўна працаваць разам, будзе знаходзіцца рашэнне і іншых пытанняў.

***«Разуменне таго, што вакол нас пачынаюць аб'ядноўвацца пэўныя сілы і цісняць на нас, і ў прэзідэнта Пуціна, і ў мяне ёсць,*** — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — ***Мы выдатна разумеем, што адбываецца вакол нашай краіны, і маем абсалютна падобную ацэнку гэтай сітуацыі. І поўныя рашучасці разам супрацьстаяць усім гэтым нападкам»,*** — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Пасля Прэзідэнт адказаў на пытанні журналістаў. Прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі цікавілі пытанні санкцый, авіяцыйных зносін. Аляксандр Лукашэнка запэўніў журналістаў, што гатовы адказваць на іх пытанні.

«Каб не было інсінуацый накшталт таго, што мы «здаём» свой суверэнітэт і незалежнасць. Нават гаворкі не было на гэтую тэму. Мы наогул пра гэта не казалі. Мы вырашалі канкрэтныя пытанні, якія дапамогуць зблізіць нас з Расійскай Федэрацыяй. Нагадаю — нам трэба толькі адно: роўныя ўмовы для суб'ектаў гаспадарання, фізічных асоб», — звярнуў увагу беларускі лідар.

### ❍ Каментарый у тэму

Падрабязнасці нарады з Прэзідэнтам у размове з журналістамі раскрыў прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка. Па яго словах, галоўнымі былі два пытанні: работа над саюзнымі праграмамі па эканамічнай інтэграцыі Беларусі і Расіі і забеспячэнне ўстойлівай работы эканомікі ва ўмовах санкцый з боку краін Захаду, у тым ліку і пагрозы ўвядзення дадатковых абмежаванняў.

Раман Галоўчанка падкрэсліў, што перагаворы з расійскімі калегамі ішлі ў актыўным рэжыме з восені мінулага года.

«Фактычна мы выходзім на фінішную прамую па ўзгадненні ўсіх саюзных праграм, якія ахопліваюць пабудову адзінай эканамічнай прасторы дзвюх краін для таго, каб забяспечыць роўныя ўмовы работы суб'ектаў гаспадарання Беларусі і Расіі. У цэлым гэтыя падыходы падтрыманы, і нам засталося дашліфаваць трохі пытанняў з тым, каб не пазней за лета завяршыць усю работу і ўнесці кіраўнікам дзяржаў падрыхтаваныя рашэнні з гэтай нагоды», — расказаў прэм'ер-міністр.

Разам з тым, гаворка не ідзе пра нейкую шкоду палітычнаму або эканамічнаму суверэнітэту Беларусі. «Мы выбудоўваем новую мадэль адносін у рамках адзінай эканамічнай прасторы, каб стварыць не проста роўныя ўмовы, а новыя мадэлі эканомік, якія павінны развівацца сінхронна», — падкрэсліў кіраўнік урада.

Расказваючы пра другі блок пытанняў, Раман Галоўчанка звярнуў увагу на тое, што санкцыі краін Захаду не пагражаюць эканоміцы Беларусі.

«Справа ў тым, што тут настолькі адсутнічае логіка, што цяжка прагназаваць. З розных бакоў гучаць розныя заявы. Мы спакойна адсочваем гэтую сітуацыю, гатовыя да розных варыянтаў развіцця падзей. Упэўненыя, што эканоміка Беларусі не толькі выстаіць і пераадолее, але і атрымае, магчыма, новы зарад бадзёрасці, каб больш актыўна працаваць на іншых рынках. Перад намі велізарная Азія, велізарны Усход. У прынцыпе, цяпер не так шмат унікальных тавараў або тэхналогій, якімі валодаюць толькі адна або некалькі краін на кантыненце. Таму мы спакойна зрабілі падлікі, далажылі кіраўніку дзяржавы сітуацыю. Зараз эканоміка працуе абсалютна ўстойліва», — расказаў прэм'ер-міністр.

Ён паведаміў, што па выніках пяці месяцаў беларуская эканоміка працягвае дэманстраваць устойлівы рост і дынамічнае развіццё.

«Экспарт ужо перавысіў узровень мінулага года на 35 працэнтаў. Упэўнена расце вытворчасць прадукцыі машынабудаўнічай галіны, нафтахімічны сектар паказвае высокія вынікі. Гатовыя да любых варыянтаў развіцця падзей, але ніякай катастрофы не прадбачыцца. Усё ў штатным рэжыме», — адзначыў прэм'ер.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Блізкая ўлада

## Чацвер — прыёмны дзень

### Члены Прэзідыума Савета Рэспублікі правядуць адзіны дзень прыёму грамадзян

**3 чэрвеня з 11.00 да 14.00 члены Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу правядуць адзіны дзень прыёму грамадзян у выканкамах Мінскага раёна:**

• старшыня Савета Рэспублікі КАЧАНАВА Наталля Іванаўна — у Бараўлянскім сельскім выканкаме (аг. Лясны, 21; тэлефон для запісу 8-017-374-32-78);

• намеснік старшыні Савета Рэспублікі ІСАЧАНКА Анатоль Міхайлавіч — у Заслаўскім гарадскім выканкаме (г. Заслаўе, вул. Вялікая, 1; тэлефон для запісу 8-017-517-85-01);

• старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве СІВЕЦ Сяргей Міхайлавіч — у Мачулішчанскім пасялковым выканкаме (г. п. Мачулішчы, вул. Гвардзейская, 13; тэлефон для запісу 8-017-516-14-72);

• старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы РАЧКОЎ Сяргей Анатолевіч — у Сеніцкім сельскім выканкаме (аг. Сеніца, вул. Набярэжная, 64; тэлефон для запісу 8-017-516-83-16).

Папярэдні запіс будзе ажыццяўляцца 2 чэрвеня з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 16.00.

Запрашальнік

## «ВЫТОКІ» НА БЕРАГАХ ДНЯПРА

**Гасцінная Аршаншчына рыхтуецца з 3 да 5 чэрвеня прыняць удзельнікаў і гасцей першага культурна-спартыўнага фестывалю «Вытокі. Крок да Алімпу». Цікава, што яго «сталіцамі» па чарзе будуць шэсць гарадоў Беларусі.**

Праект ужо з вялікім поспехам у сярэдзіне мая прайшоў у Лідзе. А пасля Оршы яго чакаюць у Кобрыне (10—12 чэрвеня), Мазыры (24—26 чэрвеня), Бабруйску (15—17 ліпеня) і Жодзіне (5—7 жніўня).

Такім чынам, гэты фэст унікальны яшчэ і таму, што мабільны.

Арганізатарамі фестывалю з'яўляюцца Нацыянальны алімпійскі камітэт Рэспублікі Беларусь, Федэрацыя прафсаюзаў Рэспублікі Беларусь, ТАА «АртХаос» і ТАА «БелБрэндаўдыт».

У інтэрнэце ўжо мноства фота, відэасюжэтаў, каментарыяў тых, хто стаў сведкамі і ўдзельнікамі лідскай часткі праекта.

Цяпер жыхары горада над Дняпром з нецярпеннем чакаюць свята з вялікай літары. Аўтары ідэі вельмі пастараліся, каб фестываль запомніўся надоўга. Цяжка анансаваць самыя цікавыя падзеі, бо няма выпадковых мерапрыемстваў на фэсце, які прэтэндуе на права лічыцца адным з самых папулярных не толькі ў Беларусі. Напрыклад, будзе багаты выбар спартыўных конкурсаў.

Асноўнымі пляцоўкамі для забаў стануць спартыўныя лакацыі, аб'яднаныя ў «Алімпійскі квэст». Удзельнікі павінны будуць выканаць пятнаццаць заданняў (па адным ад кожнага віду спорту). За паспяховае выкананне ўсіх выпрабаванняў гарантаваны прыз!

Спонсары Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі падрыхтуюць розную конкурсную праграму і анімацыі. Бацькам прадставяць інфармацыю аб спартыўных школах, якія яны могуць выбраць для свайго дзіцяці.

Цікава, дарэчы, што дыспансер спартыўнай медыцыны дасць магчымасць наведаць перасоўную лабараторыю. Там кожны жадаючы зможа прайсці дыягностыку функцыянальнага стану арганізма, вызначыць схільнасць дзіцяці да пэўных відаў спорту.

Сямейная пляцоўка будзе ўяўляць сабой месца для гульняў, квэстаў. Арганізуюць там і лаўнж-зоны для кансультацый і майстар-класаў. Для бацькоў прапануюцца тэматычныя кансультацыі педыятра «Аб здароўі дзяцей і здаровым сэнсе бацькоў».

Безумоўна, будзе чарга, каб наведаць мабільны планетарый. Не ва ўсіх жа ёсць магчымасць звазіць дзяцей у Мінск, каб паказаць стацыянарны! І арганізатары падораць гэтую «звычайную казку». Планетарый на колах уяўляе сабой двухслаёвы купал-трансформер, які адначасова ўмяшчае да дваццаці чалавек. Знаходзячыся ўнутры, можна ўбачыць фільмы (у радыусе 360 градусаў): пра космас, падводны і прыродны свет...

Вельмі інтрыгуе магчымасць наведаць і лакацыю «Арт-выстава». У рамках правядзення фестывалю — выстава карцін. Адкрыецца яна за тры дні да старту фэсту, і можна будзе азнаёміцца з творчасцю беларускіх мастакоў.

На фестывалі арганізуюць шэраг конкурсаў. У прыватнасці, у праграме вакальны конкурс «Vytoki. Голас» з перапынкамі на вакальныя майстар-класы ад членаў журы Валерыя Шмата, Гюнеш, Жанет, Ірыны Дарафеевай.

Конкурс-дэгустацыя мясцовых вытворцаў «Vytoki. Смак» — гэта смачнае свята, як кажуць, для цела і душы. Мясцовыя вытворцы прадставяць на фестывалі навінкі прадукцыі. І яе ацэняць не толькі ўсе ахвотныя, але і эксперты.

На працягу апошняга дня фэсту (5 чэрвеня) будзе працаваць канцэртна-забаўляльная пляцоўка, дзе адбудуцца майстар-класы. Пройдуць арганізаваныя чатыры дабрачынныя латарэі з розыгрышамі каштоўных прызоў ад спонсараў. У іх прымуць удзел тыя, хто на ўсіх пляцоўках фестывалю змог атрымаць квіток (жэтон) за актыўны ўдзел.

Адбудзецца канцэрт майстроў беларускай эстрады.

«Звязда» абавязкова раскажа пра свята ў наступных публікацыях.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Парламенцкі дзённік

## ШМАТ ТЭМ ДЛЯ СУПРАЦОЎНІЦТВА

### Уладзімір Андрэйчанка сустрэўся з расійскім паслом

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Расіі ў Беларусі Яўгенам ЛУК'ЯНАВЫМ. Яны абмеркавалі надзённыя пытанні супрацоўніцтва паміж краінамі. Уладзімір Андрэйчанка выказаў упэўненасць, што Яўген Лук'янаў прыкладзе максімум намаганняў, каб адносіны паміж Расіяй і Беларуссю развіваліся яшчэ больш паспяхова.**

— Беларусь надае важнае значэнне ўмацаванню і далейшаму развіццю супрацоўніцтва з Расіяй. У нас заўсёды ў аснове былі сяброўства, давер, узаемаразуменне. Мяркую, што так будзе і надалей і ў палітычнай, і ў эканамічнай, і ў культурнай сферах. Расія — наш стратэгічны партнёр, і падмуркам адносін найперш з'яўляецца эканоміка, — адзначыў спікер парламента.

— Хачу сказаць, што парламентарыі не застаюцца ўбаку ад гэтых пытанняў — развіцця палітычных, гандлёва-эканамічных, культурных адносін. У нас добрыя, канструктыўныя ўзаемаадносіны з Федэральным сходам — і з Дзяржаўнай думай, і з Саветам Федэрацыі. Мы праводзім шмат мерапрыемстваў, — звярнуў увагу Уладзімір Андрэйчанка.

Ён нагадаў, што 16 чэрвеня адбудзецца сесія Парламенцкага сходу Беларусі і Расіі, дзе будзе абмеркаваны шэраг важных пытанняў — ход выканання саюзных праграм, выкананне бюджэту, будуць выпрацаваны арыенціры па бюджэце на 2022 год. У пачатку чэрвеня пройдзе Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі. 15 ліпеня адкрыецца Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», дзе, як правіла, традыцыйна праводзіцца дзень Саюзнай дзяржавы. Парламентарыі Беларусі возьмуць удзел у назіранні за выбарамі ў Дзяржаўную думу ў верасні гэтага года.

— Графік мерапрыемстваў насычаны. Тон рабоце задаюць нашы прэзідэнты, якія сёлета ўжо сустракаліся тры разы, і прэм'ер-міністры, — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка.

Пракаментаваў спікер і апошнія падзеі:

— Час такі сёння — неспакойны, цяжкапрадказальны, я нават скажу — выбуханебяспечны. І, канешне, нам трэба часта сустракацца, абмяркоўваць розныя пытанні, дзесьці працаваць на апераджэнне, дзесьці карэкціраваць парадак дня, бо сёння не ўсім падабаецца, што на палітычнай карце свету ёсць такія дзяржавы, як Расія і Беларусь.

Уладзімір Андрэйчанка рэзюмаваў, што ў цэлым у Беларусі і Расіі шмат тэм для супрацоўніцтва, яшчэ нерэалізаваных магчымасцяў, і ў гэтым залог будучага поспеху.

Яўген Лук'янаў падзякаваў за сустрэчу і адзначыў, што быць паслом у Беларусі для яго не толькі вялікі гонар, але і вялікая адказнасць.

— Гэта тлумачыцца характарам адносін паміж нашымі краінамі і тымі праблемамі, якія мы вырашаем у рабочым парадку ў палітычным і эканамічным плане. І, канешне, ёсць адзін вялікі фактар, які мне будзе дапамагаць у рабоце. Гэта не толькі добрыя адносіны ўрада Беларусі да расійскага пасольства і Расіі, але і перш за ўсё рабочы, палітычны і чалавечы кантакт нашых кіраўнікоў.

Пасол назваў сувязі паміж парламентарыямі Расіі і Беларусі шматпланавымі і шматузроўневымі. І выказаў спадзяванне, што яны стануць сур'ёзнай падтрымкай у рабоце дзвюх дзяржаў на інтэграцыю, збліжэнне і вызначэнне тых прыярытэтаў, якія павінны забяспечвацца заканадаўчым рэгуляваннем.

**Алена КРАВЕЦ.**

### ❍ У тэму

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расіі ў Беларусі Яўген Лук'янаў у размове з журналістамі пракаментаваў рэзанансныя падзеі апошняга часу.**

**Пра сустрэчу прэзідэнтаў у Сочы:**

— Безумоўна, адносіны прэзідэнтаў нашых дзяржаў вызначаюцца сваёй якасцю. Павінен сказаць, што калі ёсць разуменне, адзіныя падыходы ў кіраўнікоў дзяржаў, то работа ўсіх астатніх структур у гэтых дзяржавах аблягчаецца.

**Пра пасадку самалёта кампаніі Ryanair у Берліне:**

— Якой чакаць рэакцыі? А вось гэта галоўнае пытанне. У французаў ёсць такі выраз — «дасціпнасць на лесвіцы»: трапляеш у нейкае нязручнае становішча, і трэба нешта сказаць, а ты не гатовы, а потым, калі цябе выставілі на лесвічную пляцоўку і дзверы закрылі, ты ўспамінаеш, што павінен быў сказаць. Дык вось, зараз мы і паглядзім, што скажуць з гэтай нагоды і ІКАО, і ўрады многіх краін, якія так актыўна адзначыліся з нагоды пасадкі самалёту ў Мінску 23 мая. Будзе вельмі цікава параўнаць. Проста ў Берліне, напэўна, штодзень такія падзеі адбываюцца, а ў Мінску гэта здарылася першы раз, — іранізуе Яўген Лук'янаў. — Адсюль, напэўна, такая розная ступень увагі да гэтага.

**Пра арышт расіянкі Софіі Сапегі:**

— Наколькі нам вядома з кантактаў нашых службовых асоб, нашых консулаў і інфармацыі адвакатаў спадарыні Софіі, адчувае яна сябе добра, умовы яе ўтрымання адэкватныя. Зразумела, што знаходжанне ў следчым ізалятары вялікай радасці не дастаўляе нікому. Ідуць следчыя дзеянні, мы чакаем іх завяршэння і фармулявання абвінавачвання па іх выніках. У гэтым кантэксце на дзеянні ўлад Беларусі мы ніякага ціску не аказваем. Мы выконваем нашы паўнамоцтвы ў межах консульскай канвенцыі і працягнем гэта рабіць. Як будуць развівацца падзеі далей, мяркую, даведаемся ў найбліжэйшы час.

## ПАВУЧЫЦЦА Ў НАС ДАКЛАДНАМУ ЗЕМЛЯРОБСТВУ ПРЫЕХАЛІ СПЕЦЫЯЛІСТЫ НАВАТ З АФРЫКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



«Што датычыцца экспарту сельгаспрадукцыі, мы гандлюем з 116 краінамі, нас ведаюць ва ўсім свеце. Мы інтэнсіўна развіваемся, летась пастаўкі за мяжу склалі ўжо 5,8 млрд долараў», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

«Ад тэхналогій да новых прадуктаў — праграма абяцае быць насычанай і цікавай. Ёсць добры патэнцыял для развіцця супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі, у тым ліку з краінамі Афрыкі», — сказаў Аляксандр Субоцін.

А экспарт беларускай сельгаспрадукцыі за пяць гадоў вырас амаль на 30 %. Так, нам ёсць чым ганарыцца, лічыць **першы намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Ігар БРЫЛО:** «У тры разы мы павялічылі продаж мяса. Краіна ўвайшла ў пяцёрку топавых экспарцёраў малочнай прадукцыі, выйшла ў лідары па экспарце ялавічыны і мяса птушкі. Сваю прадукцыю мы пастаўляем у больш за сто краін свету».

Актыўна растуць пастаўкі беларускай сельгаспрадукцыі ў Кітай. «Літаральна за пару гадоў яны сертыфікавалі нашу малочную галіну, мясаперапрацоўчыя прадпрыемствы і шэраг птушкафабрык. Зараз мы імкнёмся пашырыць асартыментны пералік прадукцыі, якая пастаўляецца. Кітай ужо выйшаў на трэцяе месца па нашых пастаўках сельгаспрадукцыі, думаю, не за гарамі момант, калі ён выйдзе на другое месца — адразу пасля Расіі», — праінфармаваў першы намеснік міністра.

На выставе айчынныя вытворцы прапанавалі як серыйную тэхніку, так і ўзоры з будучыні. Гэта камбайны ад «Гомсельмаша», сучасныя трактары з Мінскага трактарнага завода і шмат чаго яшчэ. Адна з самых буйных экспазіцый — у холдынга «Амкадор».

Па словах **намесніка дырэктара па камерцыйных пытаннях холдынга Аляксандра САНЮКА,** на выставе прадстаўлена больш за 25 узораў серыйнай тэхнікі і навінак прадпрыемства. У тым ліку ўніверсальны пагрузчык, паўпрычэпы, сеялкі, шматлікае навяснoе і прычапное абсталяванне для апрацоўкі глебы і перадпасяўной і пасляўборачнай апрацоўкі збожжа.

Ён адзначыў, што многія сельскагаспадарчыя машыны спраектаваны і ствараюцца для таго, каб замяніць імі імпартныя аналагі. Наша тэхніка значна таннейшая, а па якасці абсалютна не саступае імпартным. Доказам таму служыць тое, што на прадпрыемстве наогул не існуе запасу тэхнікі — уся прадукцыя практычна прадаецца «з колаў».

Намеснік дырэктара расказаў, што холдынг вырабляе шырокую лінейку са 125 мадэляў і мадыфікацый спецыяльнай тэхнікі, якая выпускаецца і рэалізоўваецца ва ўвязцы з поўнай закрытай тэхналогіяй у сферы дарожнага будаўніцтва, камунальнай гаспадаркі, у лясным і сельскагаспадарчым комплексах, для забеспячэння пагрузачна-разгрузачных работ. Усе прадпрыемствы холдынга інтэграваны ў адзіны тэхналагічны ланцуг. «Амкадор» пастаянна распрацоўвае новыя мадэлі тэхнікі і праводзіць работу па ўдасканаленні існуючых.

Сваім бачаннем аб рабоце гэтага прадпрыемства падзяліўся **старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Васіль СЫСОЕЎ.**

«Холдынг «Амкадор» нам вельмі блізкі, бо ён размяшчае свае асноўныя вытворчасці на тэрыторыі Мінскай вобласці, у такіх невялікіх гарадах, як Дзяржынск. У гэтых мястэчках у цяперашні час існуюць праблемныя пытанні з працаўладкаваннем, а гэтае прадпрыемства стварае новыя працоўныя месцы плюс накіроўвае дастатковыя грашовыя патокі ў бюджэт вобласці. Таму мы рады такому ўзаемавыгаднаму супрацоўніцтву вобласці і холдынга.

Акрамя таго, радуе тое, што «Амкадор» вырабляе шырокахопную тэхніку. На сёння гэта вельмі актуальна для нашых гаспадарак, бо за адзін праход апрацоўкі глебы мы выконваем работу, якую раней рабілі за два праходы. За кошт гэтага атрымліваем прамую эканомію паліва, людскіх выдаткаў і іншых матэрыяльных рэсурсаў. Яшчэ адзін плюс такога метаду апрацоўкі




зямлі агрэгатамі, якія выпускаюцца ў Дзяржынску, у тым, што такая глебаапрацоўка дазваляе сёння выраўноўваць палі. А гэта падымае культуру земляробства ў нашай краіне ў разы, што потым адбіваецца на ўраджаях збожжавых, якасці сельскагаспадарчых культур і ўзроўні жыцця на вёсцы».

Экспазіцыю Беларускага прамысловага тыдня дапоўняць выставы «Белферма» (апошнія дасягненні ў галіне жывёлагадоўлі) і «Белпрадукт» (прадукты харчавання). Аграрны форум традыцыйна збірае разам не толькі беларускіх аграрыяў і работнікаў харчовай і перапрацоўчай прамысловасцяў, але і іх замежных калег і партнёраў. Сёлета ўдзел у выставе прымаюць звыш 400 кампаній з 16 краін: Беларусі, Расіі, Вялікабрытаніі, Германіі, Францыі, Нідэрландаў, Літвы, Кітая, Польшчы, Сербіі, Швецыі, Эстоніі, Італіі, Даніі, Чэхіі, Іарданіі. Асобнымі экспазіцыйнымі блокамі будуць прадстаўлены прадпрыемствы Германіі і абласцей Расіі: Варонежскай, Растоўскай, Кіраўскай.

**Сёлета выставу наведала вельмі прадстаўнічая сумесная дэлегацыя краін Афрыкі. Гэтая дэлегацыя мае вельмі цвёрдыя намеры закупляць нашу, на іх погляд, досыць надзейную тэхніку і зразумелае абсталяванне.**

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**